Іржы Падэвет → Эдуард Пальчыс

Шаноўны спадар Эдуард Пальчыс!

Калі б мы абодва жылі ў нармальным свеце, найхутчэй мы былі б знаёмыя, хадзілі разам на піва, спрачаліся пра гістарычныя міфы і праўды, мераліся, дзе лепш жывецца – у Беларусі ці ў Чэхіі, і ўрэшце пагадзіліся б наконт галоўнага. Наконт таго, што асноўным будаўнічым каменем жыцця, а можа, і душы кожнага чалавека ёсць свабода. Вось толькі Вы жывяце не ў нармальным свеце, а свабоду Вашу і Вашага народа штодня топчуць боты міліцыянтаў. На жаль, так адбываецца перад вачыма ўсяго цывілізаванага свету, і выглядае, што Вы ў гэтым самотныя. Спадзяюся, што гэты ліст дасць Вам хоць малую надзею, што Вы ўсё ж не зусім самотны, магчыма, ён дасць Вам надзею, што калі ў Беларусі пераможа сапраўдны пераможца выбараў, мы сустрэнемся ў нармальным свеце і паспрачаемся пра гістарычныя міфы і праўды. Калі ласка, вытрымайце. Дзякуючы Вам аднойчы, і я веру, што неўзабаве, Беларусь будзе вольнай краінай.

З павагай

Іржы Падэвет

## Іржы Падэвет (нар. 1966)

пісьменнік, кніжны дыстрыбутар і выдавец, з 2006 года дырэктар выдавецтва “Academia”.



Па сканчэнні прамысловага землямернага тэхнікума Іржы Падэвет вучыўся на педагагічным факультэце Карлавага ўніверсітэта ў Празе па спецыяльнасці “чэшская мова і музычная культура”. У 1988 годзе пачаў працаваць у кнігарні, з 2004 года – выдавец, а з 2006 года – дырэктар выдавецтва “Academia”.
Іржы Падэвет ва ўласнай творчасці займаецца асабліва пратэктаратнай і паваеннай гісторыяй у чэшскіх землях, якую шырока зафіксаваў, напрыклад, у кнігах “Праваднік па пратэктаратнай Празе” (за якую атрымаў прэмію “Magnesia litera” 2014 года і прэмію “Слоўнік года” 2013); “Крывавы фінал: вясна 1945-га ў чэшскіх землях”. Таксама публікуецца ў часопісах “Analogon”, “Paměť a dějiny” і іншых.
Падэвет – аўтар кароткіх празаічных твораў “Нататкі да гісторыі” (2014), “Шыпы і петлі” (2018) і “Сны і сякеры” (2019). На інтэрнэтным тэлевізійным канале “Seznam” вядзе праграму “Крывавыя гады”, у якой знаёміць гледачоў з месцамі, звязанымі з нацысцкай і камуністычнай тыраніяй. У 2018 годзе ў выдавецтве “Academia” выйшла кніга Падэвета “Праваднік па сталінскай Празе 1948–1956: Месцы – падзеі – людзі”.

# Іржы Падэвет

→

# Эдуард Пальчыс



## Эдуард Пальчыс (30 гадоў)

папулярны блогер, публіцыст, паводле адукацыі гісторык. У 2014 годзе ў рэакцыі на расійскую інтэрвенцыю ва Украіне заснаваў сайт 1863x.com (год адсылае да проціцарскага паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве), на якім па-руску публікаваў папулярныя тэксты па гісторыі Беларусі і сучаснай палітыцы. За свае публіцыстычныя тэксты, падпісаныя псеўданімам Джон Сільвер, быў абвінавачаны ў экстрэмізме, некалькі месяцаў правёў на ўцёках ва Украіне, але потым быў затрыманы ў Расіі і перададзены ў Беларусь, дзе некалькі месяцаў заставаўся ў турме, пазней пад хатнім арыштам. У наступныя гады актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ці 100-годдзя Беларускай народнай рэспублікі. У канцы кастрычніка 2020 года быў выкрадзены, некалькі дзён яго месцазнаходжанне заставалася невядомым, пазней высветлілася, што ён адбываў 30 сутак арышту за ўдзел у дэманстрацыях. Аднак пасля 30 сутак не быў адпушчаны і пакінуты за кратамі. Пальчыса абвінавачваюць ў падрыхтоўцы масавых беспарадкаў.